**Вучэбная дысцыпліна «Фанетыка»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята<br>(агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05-0232-01 Беларуская філалогія<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент* |
| **Кароткі змест** | Беларуская мова як найважнейшы элемент нацыянальнай культуры, духоўны скарб нацыі. Мова як аснова нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Беларуская мова праз яе дачыненне да чалавека, нацыі, грамадства. Беларуская літаратурная мова. Фанетыка, яе прадмет і задачы. Фанетычнае чляненне моўнай плыні. Гукі беларускай мовы, прынцыпы іх класіфікацыі. Склад як адзінка фанетыкі. Націск і інтанацыя як суперсегментныя адзінкі фанетыкі. Законы сінтагматыкі і фанетычныя з’явы беларускай мовы. Фаналагічны аспект фанетыкі. Фаналагічная сістэма беларускай мовы. Арфаэпія, яе прадмет і задачы. Арфаэпічная норма і культура маўлення. Графіка, яе прадмет і задачы. Суадносіны паміж гукамі і літарамі. Арфаграфія, яе прадмет і задачы. Правілы правапісу. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | студэнт павінен ведаць: змест асноўных лінгвістычных паняццяў; артыкуляцыйныя і акустычныя характарыстыкі гукаў, складовую і акцэнтную структуру слова, класіфікацыю фанем;беларускія арфаэпічныя нормы прынцыпы беларускай графікі, сродкі беларускай графікі; прынцыпы беларускай арфаграфіі, арфаграфічную сістэму беларускай мовы. Студэнты павінны ўмець: карыстацца лінгвістычнай тэрміналогіяй: дыферэнцыраваць асноўныя моўныя адзінкі; характарызаваць моўныя адзінкі з пункту іх семантыкі, структуры і функцыі; праводзіць фанетычны аналіз слова; самастойна працаваць з навукова-даведачнай і метадычнай літаратурай па мовазнаўстве Студэнты павінны валодаць: нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы; паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях; формамі і метадамі лінгвістычнага аналізу рознаўзроўневых моўных адзінак; маўленчай дзейнасцю ў сістэме стылёва-функцыянальных разнавіднасцей беларускай літаратурнай мовы; навыкамі выяўлення і аналізу моўных адзінак у тэкстах; навыкамі карыстання навуковай, даведачнай і метадычнай літаратурай па беларускім мовазнаўстве; сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, інфармацыйнымі і камп’ютарнымі тэхналогіямі ў працэсе самастойнага назапашвання ведаў па мове. |
| **Прэрэквізіты** | Уводзіны ў мовазнаўства |
| **Працаёмкасць** | 108 гадзін, з іх аўдыторных – 64 гадзіны, з якіх: лекцыйных – 34 гадзіны, з якіх 4 гадзіны адводзяцца на КСР, практычных заняткаў – 30 гадзін, заліковых адзінак 3. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | экзамен у 1 семестры, тэсціраванне |